Магілёўская глыбінка як «маленькая Швейцарыя»

МС

Як у Лёзна будуць прадухіляць пажары

МС

Прыватнае жыццё — агульны набытак?

СТАР.6

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

22 студзеня 2014 г. Серада № 11 (27621) Кошт 1800 рублёў

Беларуская газета

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«НЕМАГЧЫМА СЁННЯ ЖЫЦЬ І НЕ РАЗВІВАЦЦА»

Учора Прэзідэнт сустрэўся з кіраўнікамі беларускіх СМІ і адказаў на актуальныя пытанні, якія хвалююць грамадскасць. На сустрэчу былі запрошаны кіраўнікі як дзяржаўных, так і недзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі. Размова Аляксандра Лукашэнкі з кіраўнікамі беларускіх СМІ працягвалася больш за пяць гадзін.

Фота БЕЛТА.

Упачатку сустрэчы Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што падобныя мерапрыемствы з прадстаўнікамі СМІ праводзяцца ў Беларусі планава, аднак раней яны праходзілі ў больш пашыраным складзе. «Шчыра скажу: мне даводзіцца праводзіць у такім маштабе мерапрыемствы з журналістамі, але яны мне не вельмі падабаюцца, таму што гэта падобна на нейкую лекцыю, — сказаў Прэзідэнт. — Усё-такі ў вузкім коле зацікаўленых і дасведчаных людзей можна больш падрабязна абмеркаваць тыя ці іншыя пытанні, якія сёння хвалююць людзей, і паспрабаваць, калі гэта атрымаецца, зазірнуць у недалёкую будучыню».

Кіраўнік дзяржавы таксама растлумачыў, чаму на сустрэчу былі запрошаны менавіта кіраўнікі асобных СМІ. Паводле яго слоў, галоўным крытэрыем быў уплыў і аўтарытэт таго ці іншага СМІ ў грамадстве. «Калі вызначаліся, я сказаў, што мы павінны глядзець на тое, як народ рэагуе на той ці іншы сродак масавай інфармацыі. Па многіх крытэрыях мы ўбачылі, што гэта вядучыя сродкі масавай інфармацыі Беларусі, падабаецца гэта камусьці ці не, але так атрымалася», — растлумачыў Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка таксама выказаў здагадку, што ў будучыні журналістамі будзе абыгрывацца пытанне таго, каго менавіта запрасілі на сустрэчу з Прэзідэнтам, таму кіраўнік дзяржавы палічыў за лепшае апярэдзіць магчымыя развагі і адразу растлумачыць свой выбар.

Аляксандр Лукашэнка заклікаў кіраўнікоў СМІ засяродзіцца на абмеркаванні будучага, а не кансультавацца толькі па выніках мінулага года. «Трэба, зыходзячы з ведаў па выніках мінулага года, выходзіць на больш канцэптуальныя пытанні, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Прадказваць, якой будзе Беларусь праз 5–10 ці, можа, 15 гадоў, вельмі складана, але калі будуць такія пытанні, я сваю думку выкажу, паспрабуем, калі атрымаецца, знайсці з вамі адзіную пазіцыю».

«Я гатовы да гутаркі. Форму гэтай размовы не будзем вызначаць, будзем лічыць, што ў нас сёння адбудзецца дыялог. Вельмі не хацелася б, каб вы задавалі пытанні, а я, як самы разумны і прасунуты, адказваў на вашыя пытанні — гэтага нам трэба пазбегнуць. Давайце пагаворым пра тыя праблемы, якія хвалююць людзей», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

МАДЭРНІЗАЦЫЯ З АДЦЕННЕМ ДЫВЕРСІФІКАЦЫІ

Паводле слоў Прэзідэнта, мадэрнізацыя ў Беларусі праводзіцца з адценнем дыверсіфікацыі. Перад намі стаіць задача, сказаў ён, актыўнага развіцця тых вытворчасцяў, якія арыентаваны на мясцовыя рэсурсы і сыравіну. Гэта датычыцца сельскай гаспадаркі, дрэваапрацоўкі і шэрагу іншых напрамкаў. «Мы ўсё больш і больш будзем арыентаваць нашу эканоміку на тую, хай нават бедную, сыравіну, якая ў нас ёсць», — адзначыў беларускі лідар. «Калі мы амбіцыйна заяўляем, што мы, беларусы, хочам быць суверэннымі і незалежнымі і не будзем займацца мадэрнізацыяй свайго жыцця і вытворчасці, то мы ніколі такімі не будзем. Немагчыма сёння жыць і не развівацца», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Як адзначыў кіраўнік дзяржавы, асаблівасць мадэрнізацыі ў Беларусі таксама заключаецца ў кропкавым падыходзе да гэтага працэсу. У першую чаргу прыярытэт будзе аддавацца высокарэнтабельным праектам, хоць у той ці іншай ступені ў мадэрнізацыю павінны быць уцягнуты ўсе прадпрыемствы. «Спаць нікому не дазволім. Кропкавая мадэрнізацыя з актыўнай дзяржаўнай падтрымкай была і будзе заўсёды. Той, хто дасць больш дзяржаве і народу, таго мы больш падтрымаем», — сказаў беларускі лідар. На думку Аляксандра Лукашэнкі, мадэрнізацыя павінна закранаць розныя сферы, не толькі эканоміку. «Але эканоміка — падмурак усяго нашага жыцця. Галоўны напрамак усёй мадэрнізацыі — гэта эканоміка», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Прыводзячы ў якасці прыкладу сельскагаспадарчую галіну, Прэзідэнт адзначыў, што ў выніку яе развіцця растуць аб'ёмы экспарту і якасць прадукцыі. «Сёння Еўрасаюз да нас не можа прычапіцца. Мы ў іх пытаемся: чаму вы не дазваляеце пастаўляць на ваш рынак нашы малочныя прадукты? Попыт на іх ёсць, якасць адпавядае. Па якасці не горш, чым у Еўропе. Дык вы так і скажыце, што абараняеце свой рынак і не пускаеце іншых. Нават некалькі віцебскіх або гродзенскіх прадпрыемстваў атрымалі дазвол на пастаўку ў Еўропу, а стандарты там шалёныя. Ды і ў Расіі сёння ўжо проста так не прадасі. Вось што такое мадэрнізацыя. Калі б мы гэтым не заняліся, мы б сёння пра гэта не гаварылі», — заўважыў беларускі лідар.

Прэзідэнт адзначыў, што гучыць шмат крытыкі на адрас даўгоў Беларусі. Па словах кіраўніка дзяржавы, «усё пазнаецца ў параўнанні». «Увесь наш валавы доўг — каля 50% ВУП. Да прыкладу, у ЗША — 101%, або $17 трлн, у Расійскай Федэрацыі — каля $800 млрд. Італія, Грэцыя, Ірландыя, Партугалія маюць доўг большы, чым вырабляюць за год, — звыш 100% ВУП. Што тычыцца нашага дзяржаўнага доўгу, то ён усяго толькі 18–19% ВУП, $12 млрд», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Вядома, лепш, каб яго не было, але так не бывае. Асабліва для такой эканомікі, як наша. У нас няма тых аб'ёмаў нафты, няма тых прыродных рэсурсаў, прыроднага газу, цэны на якія да гэтага часу трымаюцца. Мы ўсё гэта вымушаны купляць, таму мы наўрад ці абыдземся без гэтага», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. У той жа час ён падкрэсліў, што свае даўгавыя абавязацельствы Беларусь выконвае, выканае і сёлета. «Тое, што належыць па доўгу, мы выплацім», — заявіў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў кіраўніцтву Расіі, якое падтрымала Беларусь у цяжкія часы. «І не толькі яны падтрымалі нас у гэты момант. Нас падтрымала і Кітайская Народная Рэспубліка, і міжнародныя арганізацыі, у тым ліку і Еўразійскі банк, — сказаў Прэзідэнт. — І ёсць прапановы, вельмі выгадныя для нас, па крэдытаванні нашай эканомікі, па прадастаўленні нам фінансавых сродкаў. Але мы ўжо глядзім, каб гэта было не больш за 5%. Ёсць прапановы і пад 3%. КНР — гэта дзесьці 3%».

Гаворачы аб спадзе росту эканомікі ў Беларусі ў 2013 годзе, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што яго прычынамі з'яўляюцца як сусветны крызіс, які закрануў і расійскі, і еўрапейскі рынкі — асноўных гандлёвых партнёраў Беларусі, так і спад вытворчасці ў сувязі з недаатрыманнем расійскай нафты для загрузкі беларускіх НПЗ і з сітуацыяй у калійнай сферы. «Расія абмежавала пастаўкі нафты на нашы заводы, няхай няшмат, на пару-тройку мільёнаў тон мы атрымалі менш нафты», — сказаў ён. Што датычыцца сферы калійных угнаенняў, то тут недаатрымана $1,5–1,7 млрд. «Гэта тыя грошы, якіх нам не хапала, і ў народа з'явілася нейкая фобія, што будзе дэвальвацыя. Якраз гэтых грошай не хапала», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што папярэднія гады эканоміка Беларусі прырастала на 9,8–11 працэнтаў, як у Кітайскай Народнай Рэспубліцы. «Мы ёй нават не саступалі, гэта быў самы высокі рост. Я пабойваўся перагрэву эканомікі. Але мы тады вельмі добра прырасталі, добра займаліся вытворчасцю, правялі мадэрнізацыю некаторых буйных прадпрыемстваў, ад якіх цяпер залежыць наша жыццё. Шмат тады зрабілі, шмат будавалі, і будавалі танна, і зарплата была не меншай за $500. Гэта быў шалёны рост нашай эканомікі. І мы на сённяшні дзень ужо больш як у два разы пераўзышлі ўзровень савецкага перыяду, адзіная постсавецкая рэспубліка. Пасля такіх шалёных тэмпаў, зразумела, надыходзіць нейкі спад, ва ўсіх дзяржавах, і нам трэба было пераходзіць не проста на аб'ёмны рост эканомікі, а на якасны рост. Але вельмі шкада, што гэта супала з другой хваляй крызісу ў асноўных нашых партнёраў», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы лічыць, што, нават калі б не было сусветнага крызісу, у эканоміцы Беларусі назіраўся б спад. «Мы дасягнулі нейкага максімуму ў развіцці нашых прадукцыйных сіл і аддачы ад іх. І мы будзем расці, напэўна, да 5 працэнтаў, наўрад ці мы дабавім больш, таму што ў асноўным у нас апрацоўчая прамысловасць, і калі мы шмат прырастаем, па імпарце давядзецца шмат закупляць. Ці варта гэта рабіць? Мы знайшлі нейкую раўнадзейную», — сказаў Прэзідэнт. У той жа час ён прызнаў, што летась было ажыццёўлена няправільнае планаванне.

Ураду Беларусі даручана прапрацаваць магчымасці павышэння даходаў нізкааплатных работнікаў, заявіў кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, што, хоць сярэдняя зарплата па краіне цяпер набліжаецца да $600, многія катэгорыі работнікаў не маюць такіх даходаў. «Я з вас патрабаваць не буду павышэння зарплаты гэтай верхняй частцы насельніцтва, хто атрымлівае нават $500, вы цяпер вазьміцеся за ніжнюю частку нашых людзей і пастарайцеся падцягнуць, каб у іх было хаця б $400. Гэта стратэгія — падцягнуць нізкааплатных», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«Сёлета мы хочам звярнуць увагу на іх, тады і сярэдняя зарплата будзе значна вышэйшай. Але ўжо націскаць па зарплаце я не буду. Кожны павінен атрымліваць зарплату ў адпаведнасці з тым, як ён адпрацаваў, як спрацавала прадпрыемства. Мінімум мы забяспечылі», — дадаў беларускі лідар.

Кіраўніку дзяржавы таксама было зададзена пытанне адносна падтрымкі пенсіянераў і магчымасці кампенсацыі іх страт ад дэвальвацыі, якая адбылася ў 2011 годзе. Прэзідэнт запэўніў, што дзяржава працягне рабіць захады для павелічэння даходаў пенсіянераў. «У нас жа не кожнаму пенсіянеру трэба такая падтрымка. Ёсць пенсіянеры, якія атрымліваюць добрыя грошы. А ёсць тыя, каму трэба вялікая падтрымка, і я гэта буду рабіць, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — А выплаты, гэтыя кампенсацыі — я і хацеў бы гэта зрабіць, але адкуль іх узяць? Давядзецца ўсім кампенсаваць (нельга тут грамадства дзяліць), і пойдзе ланцуговая рэакцыя, а гэта не адзін мільярд долараў. Такіх грошай, на жаль, няма».

ПРАЦЭНТНАЯ СТАЎКА ПА КРЭДЫТАХ БУДЗЕ ЗНІЖАЦЦА

«45% — гэта шалёная стаўка. Гэта ненармальна. І мы бачым, што ў нас ёсць усе магчымасці да зніжэння гэтай стаўкі. Мы не можам пад гэтыя працэнты крэдытаваць рэальны сектар», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў свой час не было іншага выйсця, акрамя як падняць працэнтную стаўку па крэдытах. «Калі быў ажыятажны попыт і ў нас былі не такія вялікія золатавалютныя рэзервы, мы вымушаны былі ісці на гэты непапулярны крок. Але паступова, таксама не абвальна, мы прыйдзем да нармальнай з'явы», — сказаў Прэзідэнт.

У той жа час ён падкрэсліў, што галоўны паказчык — гэта праца эканомікі. Аляксандр Лукашэнка лічыць, што «мы нармальна будзем сябе адчуваць, калі сёлета нам удасца, а гэта ўжо сапраўды пралічана, дасягнуць 3–3,5% росту ВУП».

«ЗНЕШНЕ НОВЫЯ ГРОШЫ ПАДОБНЫЯ ДА ЕЎРА»

Аб правядзенні ў Беларусі дэнамінацыі будзе аб'яўлена за паўгода, аднак пакуль для гэтага няма ўмоў, заявіў Аляксандр Лукашэнка.

«Мы падумаем са спецыялістамі, калі гэты перыяд настане. Тут трэба быць вельмі асцярожнымі, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Мы гатовы ў любы момант правесці дэнамінацыю. Але ўсё ж такі нават для гэтага тэхнічнага кроку павінны быць пэўныя ўмовы. Не павінна быць такая працэнтная стаўка, не павінна быць трывогі на рынку, каб насельніцтва не хвалявалася. І ў эканоміцы каб не было крызісных з'яў».

«Таму мы падбяром час і аб гэтым заявім не менш як за паўгода, — адзначыў Прэзідэнт. — Паралельна на працягу года як мінімум будуць хадзіць і старыя рублі, і новыя».

СТАР.2

ЦЫТАТА ДНЯ

Зінаіда МАНДРОЎСКАЯ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы і сацыяльных пытаннях

«Услед за антымакавым дэкрэтам, як чакаецца, у краіне на заканадаўчым узроўні будуць прыняты новыя меры па барацьбе з наркабізнесам. Ужо вызначаны шэраг пытанняў, якія будуць унесены ў КК, а таксама ў закон аб наркотыках, прэкурсорах і іх аналагах. Прапануюцца меры па ўзмацненні адказнасці за перамяшчэнне наркотыкаў праз унутраныя межы МС. Як чакаецца, будзе ўзмоцнена і адказнасць за распаўсюджванне наркотыкаў у грамадскіх месцах і месцах адпачынку. Прапануецца таксама змяніць паняцце прытону, і лічыць такім не толькі месца, дзе ствараюць умовы для ўжывання наркотыкаў, але і вырабляюць гэтыя рэчывы».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 22.01.2014 г.

Долар ЗША	9580,00	▲
Еўра	12990,00	▲
Рас. руб.	283,50	▼
Укр. грыўня	1149,71	▲

Дзеці малююць хакей

Міністэрства інфармацыі Беларусі сумесна з Міністэрствам адукацыі, Федэрацыяй хакея і цэнтрам мастацкай творчасці дзяцей і моладзі выдавецтва «Рыфтур» праводзіць конкурс на лепшы малюнак, прысвечаны чэмпіянату свету па хакеі, які адбудзецца ў Мінску з 9 па 25 мая.

Канкурсанты будуць падзелены на дзве ўзроставыя групы: ад 8 да 11 і ад 12 да 16 гадоў. Творчыя працы можна выконваць у розных жанрах пры дапамозе любых матэрыялаў — ад каляровых алоўкаў да алейных фарбаў. Дарэчы, да ўдзелу ў конкурсе дапускаюцца не толькі індывідуальныя, але і калектыўныя творы. Студыям, гурткам і школам дазваляецца даслаць не больш за дваццаць малюнкаў, асобным аўтарам — максімум два.

Конкурсныя працы трэба паспець адправіць да 15 лютага на адрас: г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 19 а, выдавецтва «Рыфтур». Лепшыя творы, якія выберуць да 15 сакавіка, не толькі будуць прадстаўлены на выставе падчас вясновых канікулаў у Нацыянальным цэнтры мастацкай творчасці дзяцей і моладзі, а таксама ўпрыгожаць спецыяльныя паштоўкі.

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

У ЗША НЕ СПЫНЯЕЦЦА СНЕЖНАЯ БУРА

Адміністрацыя ЗША абвясціла пра закрыццё дзяржаўных устаноў у Вашынгтоне з-за снежнай буры, якая ў аўторак абрынулася на паўночнаатлантычнае ўзбярэжжа і паўночны ўсход краіны. Таксама густы снег будзе ісці ў Нью-Ёрку і Філадэльфіі. Многія школы і офісы ў акрузе Калумбія таксама зачыняюцца. Студзень стаў анамальна халодным месяцам у ЗША. Мінусавая тэмпература была зарэгістравана ва ўсіх 50 штатах, уключаючы Гаваі. Зараз на ЗША і Канаду насоўваецца новая палярная віхура.

ЖЫРЫНОЎСКІ СУПРАЦЬ ТОЎСТЫХ ДЭПУТАТАЎ

Лідар ЛДПР Уладзімір Жырыноўскі прапануе ўвесці яшчэ адзін стандарт здаровага ладу жыцця для дэпутатаў і чыноўнікаў — іх вага не павінна перавышаць 80 кілаграмаў. «Калі вышэй — чыноўніка з працы звальняць. І дэпутата», — заявіў кіраўнік ЛДПР. Ён адзначыў, што сёння ўвесь свет змагаецца з атлусценнем, і таксама дадаў, што цукар, соль, чай і кава шкодныя для здароўя — «усё канцэрагены або наркотыкі».

НЕ ПРЫМУШАЙЦЕ ДЗЯЦЕЙ ДАЯДАЦЬ

Калі дзіця есць, седзячы за сталом, то верагоднасць развіцця атлусцення значна зніжана, паказаў эксперымент.

Таксама высветлілася, што дзеці, якія самі вызначаюць порцыі страў, з'ядаюць менш, чым дзеці, якім падаюць ежу бацькі. Менавіта пры такіх умовах дзіця вучыцца распазнаваць, калі яно наядаецца. Навукоўцы прасачылі за дзецьмі 2—5 гадоў. Высветлілася, што сямейная вячэра за сталом таксама дапамагала засвоіць інфармацыю і пра порцыі, і пра перавагу ў ежы. Па гэтай жа прычыне нельга прымушаць дзіця даядаць усё, што ёсць на талерцы. Важна даваць дзіцяці правільныя ўказанні з разраду: «Калі ты галодны, можаш узяць дабаўку». У любым выпадку дзіця кампенсуе недахоп ежы за дзень. Бацькі, якія дазваляюць дзіцяці есці перад тэлевізарам, штурхаюць яго да атлусцення, бо яно не адчувае, калі наелася. Дарэчы, раней было даказана, што практыка сямейнай вячэры перад тэлевізарам негатыўна ўплывае на вагу ўсіх членаў сям'і.

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 14011>

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

85 ЧАЛАВЕК ВАЛОДАЮЦЬ ПАЛОВАЙ БАГАЦЦЯЎ СВЕТУ

Эканамічная няроўнасць у свеце ўзрасла да такой ступені, што сукупнае багацце 85 найбагацейшых людзей планеты (гэта каля 1,7 трыльёна долараў) раўняецца агульнаму багаццю 3,5 млрд звычайных людзей — паловы насельніцтва планеты, паведамляе газета «Взгляд» са спасылкай на апублікаваны даклад у The Guardian.

У дакладзе «Праца для нямногіх» сцвярджаецца, што няроўнасць з'явілася вынікам захопу ўлады з боку эканамічнай эліты, якая атрымлівае магчымасці ціску на ўрады з мэтай прасоўвання выгаднай ёй палітыкі. Так, па статыстыцы амаль паловай сусветнага багацця (46%) валодае адзін працэнт насельніцтва, якому ўвогуле належыць 110 трыльёнаў долараў. Гэта ў 65 разоў больш, чым фінансавыя сродкі найбяднейшай часткі насельніцтва.

Працэс засяроджвання сусветнага багацця ў руках усе меншай колькасці людзей працягваецца. Летась мільярдэрамі сталі 210 чалавек. У выніку іх колькасць павялічылася да 1426, а іх агульнае багацце склала 5,4 трыльёна долараў. У якасці прыкладу размеркавання багацця ў краінах, якія развіваюцца, прыводзіцца сітуацыя ў Індыі. Там за апошняе дзесяцігоддзе колькасць мільярдэраў вырасла з 6 да 61 чалавека, і яны засяродзілі ў сваіх руках сукупныя сродкі ў памеры 250 мільярдаў долараў. Да 2008 года на мільярдэраў у Індыі прыпала 26% ад багацця ўсяго насельніцтва, тады як у 2003 годзе гэты паказчык складаў 1,8%.

КОРАТКА

Прадстаўнік Беларусі на міжнародным песенным конкурсе «Еўрабачанне-2014» ТЕО выступіць у другой частцы другога паўфіналу, які адбудзецца ў Капенгагене (Данія) 8 мая.

У адпаведнасці з распараджэннем Прэзідэнта Беларусі пачалася праверка баявой гатоўнасці Узброеных Сіл. Напярэдадні чэмпіянату свету 2014 года па хакеі асаблівая ўвага будзе ўдзелена арганізацыі аховы аб'ектаў, транспартных камунікацый і ўчасткаў дзяржаўнай граніцы. Акцэнт у праверцы робіцца на ВПС і войскі ППА, якія ахоўваюць не толькі паветраныя рубяжы краіны, але і знешнюю граніцу Саюзнай дзяржавы.

На 1 студзеня 2014 года ахоп насельніцтва Беларусі наземным лічбавым тэлевізійным вяшчаннем склаў 97,41 працэнта.

Праграма развіцця чыгуначных пунктаў пропуску на дзяржаўнай граніцы Беларусі прадоўжана па 2020 год уключна. Раней яе прадугледжвалася завяршыць у 2017 годзе. Перанос тэрмінаў звязаны з цяжкасцямі ў фінансаванні.

НОВАЎВЯДЗЕННІ У ЖКГ:

кошт паслуг будзе адрозніваццa ў залежнасці ад рэгіёна?

Плануецца, што ў 2014 годзе ўзровень кампенсацыі насельніцтвам затрат на аказанне жыллёва-камунальных паслуг складзе каля 30%. Пра гэта заявіла падчас анлайн-канферэнцыі на сайце БЕЛТА «Новаўвядзенні ў сістэме ЖКГ» начальнік упраўлення эканомікі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Алена Дудзінская.

Павелічэнне тарыфаў не перавысіць 5 долараў за год

Канчатковы сабекошт 2013 года, па словах Алены Дудзінскай, пакуль не вядомы і будзе відаць па справаздачах трохі пазней. Па чаканай ацэнцы, у 2013 годзе насельніцтва аплачвала каля 25% сабекошту фактычных затрат на паслугі ЖКГ.

Начальнік упраўлення эканомікі Міністэрства ЖКГ нагадала, што ва Указе № 550 прапісаны нормы, па якіх павелічэнне тарыфаў будзе ажыццяўляцца за год у памеры не вышэй за 5 долараў у эквіваленце па сярэднегадавым курсе. Такое павышэнне ўжо адбылося з 1 студзеня: на 3,72 долара былі павышаны тарыфы на электрычную энергію, газ і цеплавую энергію і на 1,28 долара павышаны тарыфы на паслугі арганізацый сістэмы Мінжылкамгаса. У далейшым у адпаведнасці з указам тарыфы для насельніцтва мяркуецца індэксаваць на рост намінальнай заработнай платы, каб звязаць павелічэнне тарыфаў з ростам даходаў насельніцтва. Такая індэксацыя прадугледжана для таго, каб не зніжаўся ўзровень кампенсацыі насельніцтвам затрат на паслугі ЖКГ. Такім чынам улічваюцца інфляцыйныя працэсы.



СТАР.3